2. *Геродот.* История / Геродот ; пер Г. А. Стратановский. – М. : АСТ, 2017. – 829 с. – (Серия. Эксклюзивная классика. Книги, изменившие мир. Писатели, объединившие поколения).

3. *Исаев, Е. М.* Публичная история в России: научный и учебный контекст формирования нового междисциплинарного поля / Е. И. Исаев // Вестн. Перм. ун-та. – 2016. – Вып. 2 (33). – С. 7–13.

4. *Лоуэнталь, Д.* Прошлое – чужая страна / Д. Лоуэнталь ; пер. с англ. А. В. Говорунова. – СПб. : Владимир Даль : Русский Остров, 2004. – 622, [1] с.

5. *Нора, П.* Франция-память : сб. / П. Нора [и др.] ; пер. с фр. Д. Хапаевой ; науч. конс. пер. Н. Копосов. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1999. – 328 с. – (Новая петербургская библиотека. Коллекция «Память века»).

6. *Рикер, П.* Память, история, забвение : пер. с фр. / П. Рикер. – М. : Изд-во гуманит. литературы, 2004. – 728 с. – (Французская философия XX века).

УДК 72(476):929.652

**Н. А. Лінькова,**

*саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ВОБРАЗЫ АРХІТЭКТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ Ў ГРАФІЦЫ І НА ПАМЯТНЫХ МАНЕТАХ: КАМПАРАТЫЎНЫ АНАЛІЗ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца пытанне адлюстравання і рэпрэзентацыі вобразаў нацыянальнай архітэктурнай спадчыны з пункту гледжання пазіцый мастацтвазнаўства ў сучасных творах прасторавых мастацтваў на прыкладзе графікі і дызайну памятных манет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Аналізуюцца цыкл каляровай літаграфіі «Помнікі дойлідства Беларусі» вядомага беларускага графіка У. С. Басалыгі і мастацкае афармленне серый памятных манет: «Помнікі архітэктуры Беларусі» і «Архітэктурная спадчына Беларусі». Дадзеная з'ява ў беларускім мастацтве дапамагае ствараць уяўленне аб дасягненнях былых часоў і іх захаванні ў сучаснасці.

**Ключавыя словы:** архітэктура, графіка, дызайн, матэрыяльная і духоўная культура, мастацкі вобраз, нацыянальная культурная спадчына, рэпрэзентацыя культурных каштоўнасцей, памятныя манеты.

**N. Linkova,**

*Competitor of a scientific degree of candidate of sciences of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## IMAGES OF THE ARCHITECTURAL HERITAGE OF BELARUS IN GRAPHICS AND ON COMMEMORATIVE COINS: COMPARATIVE ANALYSIS

**Abstract.** The article considers the issue of reflection and representation of images of the national architectural heritage from the point of view of art criticism in modern works of spatial arts on the example of graphics and design of

commemorative coins of the National Bank of the Republic of Belarus. The author analyzes the cycle of color lithographs "Architectural Monuments of Belarus" by the famous Belarusian graphic artist U. Basalyga and the artistic design of the series of commemorative coins: "Architectural Monuments of Belarus" and "Architectural Heritage of Belarus". This phenomenon in Belarusian art helps to create an idea of the achievements of the past and their preservation in the present.

**Keywords:** architecture, graphics, design, material and spiritual culture, artistic image, national cultural heritage, representation of cultural values, commemorative coins.

Помнікі архітэктуры Беларусі з'яўляюцца неад'емнай часткай нацыянальнай культурнай спадчыны. Ва ўсёй шматстайнасці беларускай архітэктуры бачны ўплыў як усходняй, так і заходняй культур. На тэрыторыі краіны захаваліся помнікі архітэктуры раманскага стылю і готыкі, барока і класіцызму, мадэрну і эклектыкі і г. д. Дзеячы беларускай культуры (мастакі, пісьменнікі, дызайнеры і інш.) у творах праз розныя мастацкія сродкі адлюстроўваюць дасягненні беларускіх дойлідаў, каб захаваць іх вобразы для нашчадкаў.

Дадзеную тэму ў нацыянальным каларыце раскрывае вядомы беларускі графік У. С. Басалыга (1940–2020). Галоўнай тэмай у творчасці мастака з'яўляецца адлюстраванне развіцця нацыянальнай культуры беларусаў (народны фальклор і вераванні, традыцыйны быт, архітэктура, беларуская мова і літаратура і інш.). Найбольш яркім прыкладам сярод твораў майстра выступае цыкл каляровай літаграфіі «Помнікі дойлідства Беларусі» (1977–1984). Першыя графічныя аркушы дадзенага цыкла з'явіліся ў сярэдзіне 1970-х гг. Ідэю стварэння цыкла мастаку падказаў вядомы беларускі пісьменнік У. С. Караткевіч.

«Касцёл у Ішкальдзі» (1977), «Царква ў Малым Мажэйкаве» (1977), «Замак у Міры» (1977) дэманструюць агульнае рашэнне, вобразнае і кампазіцыйнае, якое будзе выкарыстана, так ці інакш, ва ўсіх (больш за 20) працах серыі [2, с. 16]. Пасля У. Басалыга стаў пераводзіць свае малюнкі ў літаграфію. Адзначым, што дадзеная тыражная графічная тэхніка дазваляе атрымліваць дзясяткі якасных адбіткаў з літаграфскага каменю. Наступныя графічныя аркушы мастака дапаўняюцца выявамі Камянецкай вежы (1983), Каложскай царквы ў Гродне (1983), Спаса-Ефрасіннеўскай царквы ў Полацку (1983), замка ў Нясвіжы (1983, 1986) і інш.

Цыкл «Помнікі дойлідства Беларусі» спалучыў рысы прафесійнага і народнага мастацтва. Кожная манументальная кампазіцыя з'яўляецца своеасаблівым «партрэтам» аб'екта архітэктурнай спадчыны. Па аўтарскай задуме кожны помнік архітэктуры вылучаецца рамкай. Паміж знешняй рамкай ліста і ўнутранай, што атачае аб'ект, мастак змяшчае стужкі, ручнікі, разнастайныя кветкі, лісце, букеты, якія сімвалізуюць яго захопленасць прыгажосцю і веліччу архітэктуры, талентам архітэктараў і будаўнікоў [2, с. 17]. Статыку выявы мастак

дапаўняе як дынамікай падачы прадметнага асяроддзя, так і бясконца разнастайным небам, дрэвамі, што хіляцца пад ветрам, знічкай [2, с. 18]. Такім чынам, для твораў У. Басалыгі характэрны сувязь з традыцыямі беларускага народнага мастацтва і дэкаратыўнасць.

Архітэктурная спадчына Беларусі таксама велічна адлюстравана ў дзвюх серыях памятных манет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь: «Помнікі архітэктуры Беларусі» («Памятники архитектуры Беларуси») і «Архітэктурная спадчына Беларусі» («Архитектурное наследие Беларуси»), а таксама дадаткаў да апошняй серыі ў выглядзе камплектаў памятных манет, якія выйшлі ў свет у 2018, 2019, 2020, 2021 і 2023 гг.

Найбольш прыкметным момантам, які дазваляе праводзіць кампаратыўныя паралелі паміж творамі беларускага графіка У. С. Басалыгі і мастацкім афармленнем памятных манет Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, створаных цэлай камандай айчынных дызайнераў і мастакоў, з'яўляецца падабенства сюжэтаў і вобразаў.

Звернем увагу на тое, што Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь акрамя паўсядзённых хадавых манет актыўна вядзе выпуск памятных манет, прысвечаных знамянальным датам і з'явам у гісторыі станаўлення і развіцця нашай дзяржавы. Сярод манет, выпушчаных у зварот у перыяд з 1996 г. па сённяшні дзень, асаблівую цікавасць уяўляюць памятныя манеты, прысвечаныя гісторыі і культуры Беларусі. Так, напрыклад, для адлюстравання на манетах тэматыкі нацыянальнага дойлідства як адной са значных частак матэрыяльнай і духоўнай спадчыны пачаты ў 1998 г. выпуск памятных манет з выявамі помнікаў архітэктуры.

У мастацкім афармленні памятных манет серыі «Помнікі архітэктуры Беларусі» (1998–2018) паўстаюць такія шэдэўры беларускага дойлідства мінулых стагоддзяў, як замак Радзівілаў і фарны касцёл у Нясвіжы, Мірскі замак, Сафійскі сабор у Полацку, царква-крэпасць у Сынкавічах, Камянецкая вежа і інш. У адрозненне ад выяў гэтых жа помнікаў архітэктуры на графічных аркушах У. С. Басалыгі, яны больш лаканічныя, дэкаратыўныя элементы на іх амаль адсутнічаюць, што звязана з асаблівасцямі матэрыялу і памеру плошчы для ўвасаблення мастацкай задумкі дызайнера.

У 2018 г. названая серыя дапоўнена камплектам памятных манет серыі «Архітэктурная спадчына Беларусі» («Архитектурное наследие Беларуси»), які складаецца з 6 манет і ўключае па 1 манеце кожнага наймення ў складзе: памятная манета «Мірскі замак» («Мирский замок»), «Замак Радзівілаў. Нясвіж» («Замок Радзивиллов. Несвиж»), «Палац Румянцавых і Паскевічаў. Гомель» («Дворец Румянцевых и Паскевичей. Гомель»), «Камянецкая вежа» («Каменецкая башня»), «Мікольская царква. Магілёў» («Никольская церковь. Могилев»), «Сафійскі сабор. Полацк» («Софийский собор. По-

лоцк») [1]. У наступныя гады серыя дапаўнялася дадатковымі камплектамі манет.

Як бачым, некаторыя помнікі архітэктуры паўтараюцца ў 2 серыях манет. А на некалькі дзесяцігоддзяў раней, яны былі зафіксаваны ў графічных творах У. С. Басалыгі. Сярод іх важна адзначыць наступныя: Сафійскі сабор у Полацку – унікальны помнік культавай архітэктуры XI ст., замкавы комплекс «Мір» XVI–XVIII стст. – архітэктурны аб'ект вышэйшай катэгорыі помнікаў сусветнай культуры, які знаходзіцца ў спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА (з 2000 г.). Яшчэ адзін аб'ект з спіса – архітэктурны ансамбль замка Радзівілаў у Нясвіжы XVI–XIX стст., які ілюструе значны перыяд гісторыі развіцця чалавецтва (уключаны з 2005 г.).

Важна адзначыць 2 архітэктурныя аб'екты, якія займаюць ганаровае месца на памятных манетах серыі «Помнікі архітэктуры Беларусі» і ў вышэйназваным цыкле каляровай літаграфіі У. С. Басалыгі. Гэта царква-крэпасць у в. Сынкавічы Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці, якая ўяўляе ўнікальны ўзор храмаў абароннага тыпу і сінтэзуе ў абліччы рысы готыкі і Рэнесансу (пабудавана на мяжы XV–XVI стст.). Камянецкая вежа XIII ст. – унікальны помнік сярэдневяковага абарончага дойлідства, размешчаны ў г. Камянец Брэсцкай вобласці.

Яшчэ адна значная рыса, якая аб'ядноўвае графічны цыкл «Помнікі дойлідства Беларусі» і серыі памятных манет «Помнікі архітэктуры Беларусі» і «Архітэктурная спадчына Беларусі» – надпіс назвы архітэктурнага помніка. У абодвух выпадках – гэта велічныя шрыфтавыя кампазіцыі, якія падкрэсліваюць значнасць прадстаўленых архітэктурных помнікаў.

Такім чынам, графічныя творы У. С. Басалыгі з серыі «Помнікі дойлідства Беларусі» і памятныя манеты серый, прысвечаных архітэктурным помнікам, канцэнтруюць увагу грамадскасці на значнасці прадстаўленай нацыянальнай культурнай спадчыны ў гісторыі краіны.

Адзначым, што гэта пытанне застаецца актуальным не толькі для вузкага кола навукоўцаў. Так, напрыклад, дадзеная тэма ў апошні час больш шырока праецыруецца праз сучасныя інфармацыйныя сродкі. Так, у 2018 г. на айчынным тэлебачанні з'явіўся спецыяльны тэлевізійны праект «Архітэктура Беларусі» (тэлеканалы «Беларусь 3» і «Беларусь 24»), які ствараецца сумесна з дзяржаўнай навуковай установай «Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Кожны выпуск перадачы, як у выпадку з графічнымі творамі і памятнымі манетамі, прысвечаны аднаму канкрэтнаму архітэктурнаму аб'екту.

1. Банкноты и монеты Национального банка Республики Беларусь. Общие сведения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nbrb.by/Coins Banknotes. – Дата доступа: 20.03.2021.

2. *Вайцэхоўская, В. У.* Славутыя мастакі з Беларусі. Уладзімір Басалыга / В. У. Вайцэхоўская. – Мінск : Беларусь, 2022. – 95 с.

3. Каталог памятных монет, выпущенных в обращение Национальным банком Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nbrb.by/CoinsBanknotes/Coins/Commemorative/Catalog. – Дата доступа: 15.08.2024.

УДК 021:37.091.4Сухомлинский

**І. І. Ліхараў,**
*настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва імя М. Ф. Сафонава», Магілёў, Беларусь*

## ПОГЛЯДЫ ВАСІЛЯ СУХАМЛІНСКАГА НА МЕСЦА БІБЛІЯТЭКІ Ў АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ШКОЛЫ

**Анатацыя.** У артыкуле раскрываецца месца бібліятэкі ў педагагічнай сістэме выдатнага савецкага педагога-наватара В. А. Сухамлінскага «Школа радасці» як цэнтра духоўнага жыцця навучальнай установы і важнейшага рэсурсу навучання і выхавання. Выдзелены прыярытэтныя напрамкі дзейнасці школьнай бібліятэкі: кіраўніцтва чытаннем, узаемадзеянне бібліятэкара і педагогаў, камплектаванне бібліятэчных фондаў, арганізацыя «вечнай бібліятэкі», бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне навучэнцаў і работа з бібліятэчным актывам.

**Ключавыя словы:** школьныя бібліятэкі, бібліятэчнае абслугоўванне навучэнцаў, кіраўніцтва чытаннем, камплектаванне бібліятэчных фондаў, «вечная бібліятэка», бібліятэчны актыў.

**I. Likharau,**
*History teacher of the State educational institution "Secondary school No. 19 of Mogilev named after M. Safonov", Mogilev, Belarus*

## VASILY SUKHOMLINSKY'S VIEWS ON THE PLACE OF THE LIBRARY IN THE EDUCATIONAL SPACE OF THE SCHOOL

**Abstract.** The article reveals the place of the library in the pedagogical system of the outstanding Soviet teacher-innovator V. Sukhomlinsky "School of Joy" as the center of the spiritual life of the educational institution and the most important resource of education and upbringing. The author highlights the priority areas of the school library's activity: the management of reading, the interaction of librarian and teachers, the acquisition of library collections, the organization of the "eternal library", library and bibliographic services for students and work as a library asset.

**Keywords:** school libraries, library services for students, reading guidance, acquisition of library collections, "eternal library", library asset.